# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 2 чэрвень 2013

*Мілавідскі фэст* – с. 2
*Рада ў асобах: Алесь Сілкоў* – с. 3
*Мілінкевіч: Рэформы ці сыход!* – с. 6
*Конкурс пра Каліноўскага. Фінал.* – с. 7

# Рэферэндум пераменаў

**Рух «За Свабоду», Партыя БНФ і кампанія «Гавары праўду» дамовіліся пра стратэгічнае партнёрства ды ініцыявалі кампанію «Народны рэферэндум».**




Гаворка вядзецца пра супрацу па рэалізацыі доўгатэрміновай і канкрэтнай палітычнай праграмы. Лідары трох структур падкрэсліваюць, што такое ў беларускай апазіцыі адбылося ўпершыню.

Ажыццяўленне плана «Народны рэферэндум» пройдзе праз тры электаральныя кампаніі – мясцовыя, парламенцкія, прэзідэнцкія выбары.

## «Краіна цяжарная пераменамі»

Павесткай «Народнага рэферэндума» стануць надзённыя пытанні, якія будуць вызначаны большасцю грамадзян Беларусі. Нечым падобным Рух «За Свабоду», Партыя БНФ і «Гавары праўду» ўжо займаюцца: гаворка адпаведна пра «Народную праграму», праграму нацыянальнай бяспекі і «Грамадзянскую дамову».

Цяпер вызначаць тое, якіх менавіта сістэмных зменаў жадаюць беларусы, апазіцыя будзе разам і больш актыўна.

*«Краіна цяжарная пераменамі. 80% насельніцтва хочуць эканамічных пераменаў, палова – палітычных, чаго не было раней. Людзі хочуць пераменаў, лепшага жыцця, але мала хто можа сфармуляваць канкрэтна – якія перамены патрэбныя? І каму даручыць правядзенне рэформаў? Якая праграма прыдатная? Пры гэтым грамадства хоча эвалюцыйных, мірных пераменаў. Улада сама на іх не пойдзе. Два варыянты: альбо грамадства прымушае яе гэта зрабіць, альбо народ зробіць перамены з іншай ўладай. То самае можна сказаць і пра апазіцыю, у якой народ пакуль не бачыць сілы, якая ведае, як праводзіць сур'ёзныя перамены. Апазіцыі трэба перастаць змагацца паміж сабой, гаварыць на адной мове з народам, абудзіць веру ў грамадстве»*, – разважае лідар Руху «За Свабоду» **Аляксандр Мілінкевіч**.




## Па правілах грамадства

*«Мы разглядаем «Народны рэферэндум» як форму рэалізацыю лістападаўскага мемарандума ў падтрымку Рады БНР аб захадах у абарону незалежнасці Беларусі»*, – заявіў старшыня Партыі БНФ **Аляксей Янукевіч**. На яго думку, *«разам будзе лягчэй адстойваць як палітычныя мэты кожнай арганізацыі, так і нацыянальныя інтарэсы»*.

*«Мы аб'ядноўваемся, ставячы на мэце палітычныя і эканамічныя змены, што немагчыма без змены ўлады»*, – сказаў лідар «Гавары праўду» **Уладзімір Някляеў**.

**Працяг на с. 4**



# Мілавідскі фэст



**Некалькі соцень чалавек сабраў напачатку чэрвеня Мілавідскі фэст. Ён быў прысвечаны 150-годдзю ўдалай для паўстанцаў Кастуся Каліноўскага бітве пад Мілавідамі. Паездку на імпрэзу арганізаваў у тым ліку Рух «За Свабоду». Рэй вёў сябра Рады Руху, кіраўнік баранавіцкай арганізацыі ТБМ Віктар Сырыца.**

Удзельнікі імпрэзы маглі ўзяць удзел у віктарыне, прысвечанай паўстанню Касутся Каліноўскага, надпісаць паштоўку палітвязню, скарыстаўшыся «поштай касінераў», атрымаць прыгожыя паштоўкі і буклеты, а таксама адмысловы нумар газеты «Мужыцкая праўда». Усіх частавалі караваем і квасам, прыгатаванымі ў палявых умовах кашай і аладкамі.

Мастацкую частку імпрэзы склалі амаль паўнавартасныя канцэрты бардаў Змітра Бартосіка і Віктара Шалкевіча, а таксама рэканструкцыя двубояў у выкананані баранавіцкага рыцарскага клуба «Шляхецкая застава».

А перад гэтым людзі запалілі знічы, усклалі кветкі і вянкі каля каталіцкай капліцы і валуна з шыльдай пра Мілавідскую бітву. У гонар загінулых паўстанцаў прагучаў гімн-малітва «Магутны божа».

Дарэчы, напярэдадні круглай даты мясцовыя ўлады адрамантавалі помнікі ў гонар паўстанцаў ля Мілавідаў. Спецыялісты Баранавіцкага завода санэлектранарыхтовак адрамантавалі дах і пафарбавалі мемарыяльную каталіцкую капліцу, а таксама чыгунны праваслаўны крыж і пастамент каменя-валуна, якія ўсталяваны на месцы Мілавідскай бітвы касінераў Кастуся Каліноўскага і Аляксандра Лянкевіча з царскім войскам 22 траўня (3 чэрвеня па старым стылі) 1863 года.



Гэта стала рэакцыяй на калектыўны зварот з 148 подпісаў грамадзян за тэрміновы рамонт помнікаў у гонар паўстанцаў 1863 года.

*«Мы прасілі Мілавідскі сельскі савет арганізаваць працу па рамонце помнікаў і добраўпарадкаванні тэрыторыі з нагоды 150-х угодкаў Мілавідскай бітвы 1863 года. Таму выказваем шчырую падзяку кіраўніцтву Баранавіцкага раёна і Мілавідскага сельскага выканаўчага камітэта за выкананне сваіх абяцанняў і зробленую працу»*, – кажа **Віктар Сырыца.**

Але не ўсё так ідылічна ў дачыненнях з уладамі.

Пасля Мілавідскага фэста Сырыцу выклікалі ў міліцыю: маўляў, ён здзейсніў адміністрацыйнае правапарушэнне – правёў несанкцыянаванае мерапрыемства (быў складзены адпаведны пратакол): *«Баранавіцкі райвыканкам двойчы незаконна нам забараняў правядзенне культурна-гістарычнага свята. Лічу, што не мы парушылі закон, а Баранавіцкі райвыканкам не выконвае арт. 51 Канстытуцыі Беларусі і не дае нам права на ўдзел у культурным жыцці».*



*«2 чэрвеня мы вырашылі ўзяць удзел у мерапрыемствах, якія мела намер арганізаваць улада ў гонар Мілавідскай бітвы. А з-за таго, што у прызначаны час там нічога не адбывалася, мы ўсклалі кветкі да помніка касінерам. Пасля чаго пераехалі ў вёску Русіна, дзе на сядзібе баранавіцкага аддзялення Таварыства беларускай мовы правялі запланаваныя намі помныя мерапрыемствы»*, – сказаў рухавец

На яго думку, дзеянні ўладаў яўна выходзяць за межы закону і цвярозага розуму: *«Мы маем права шанаваць памяць і адзначаць значныя*






# Рада ў асобах: **Алесь Сілкоў**

**Мы працягваем прадстаўляць у бюлетэні Руху «За Свабоду» сябраў Рады арганізацыі. Гэтым разам у рубрыцы «Хто ёсць хто?» услед за кіраўніком гомельскага абласнога аддзялення Пятром Кузняцовым лідар магілёўскага – Алесь Сілкоў. Пытанні тыя самыя.**



**– Чаму Вы ў Руху «За Свабоду»?**

– Бо зразумеў, што пасля 2006 году з'явіўся лідар, з якім большасць насельніцтва звязвала перамены. І трэба яму дапамагаць сваімі сіламі.

**– Чаго чакаеце ў арганізацыі для самарэалізацыі? Якія Вашыя амбіцыі ў палітыцы, грамадскай дзейнасці?**

– Павярнуць карабель пад назвай Беларусь у правільны бок. Амбіцыі? Ад механіка да капітана.

**– Плюсы і мінусы Руху?**

– Перавага – добрая кампанія. Мінус – шмат тактычных пралікаў.

**– Што трэба рабіць Руху дзеля большага плёну?**

– Больш кампрамісу, і стварыць пляцоўку для праеўрапейскіх сіл.

**– Ваш прагноз развіцця сітуацыі ў Беларусі на бліжэйшыя некалькі гадоў?**

– Вельмі дрэнны.

## Бліц-апытанка

**– Узорныя для Вас асобы ў палітыцы (Беларусь і свет)?**

– Мілінкевіч, Ганчар у Беларусі. У свеце – Меркель.

**– Апошнія ўпадабаныя прачытаныя кнігі, прагледжаныя фільмы, праслуханая музыка?**

– Айн Рэнд, «Атлант расправіў плечы», «Меланхолія» Ларса фон Трыера…

**– Улюбёныя віды спорту (у іх каманды, спартоўцы)?**

– НХЛ і «Таронта», футбол і «Днепр», гульцы – Салей, Марадона.

**– Улюбёныя прымаўкі, афарызмы, слоганы?**

– Я падрыхтую сябе, і мой шчаслівы час надыдзе (А. Лінкальн).

**– Заняткі, што даспадобы, у пазапалітычны, пазапрацоўны час?**

– Прэферанс з сябрамі (але часу няма), гуляць з дзецьмі.

**– Топ-5 улюбёных краін?**

– ЗША, Данія, Арменія, Літва, Польша

**– Улюбёныя мясціны ў Беларусі?**

– Мінск, вуліца Вялікая Садовая ў Магілеве, Клічаў, Гародня.

**Тры побытавыя рэчы, без якіх Вам няўтульна?**

– «Прэсбол», інтэрнэт, душ раніцай.

**– З чым у сабе змагаецеся?**

– Каб даводзіць усе справы да канца. Берагчы час іншых людзей.

**– Раскажыце добры анекдот:**

– Добрыя ўсе ведаюць. А дрэнны – не ведаю.

**Біяграфія:**

Нарадзіўся 13 жніўня 1969 году ў вёсцы Незаўка Магілеўскага раёна.

Жонка – Аксана, маю дваіх дзетак: Ягор (1 год), Насця (3 гады). Маці – 88 гадоў, бацька памёр, калі мне было 7 гадоў.

Адукацыя вышэйшая: гістфак Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта; магістратура Данецкага дзяржаўнага ўніверсітэта кіравання, кіраванне праектамі і праграмамі. У 2000-2004 гадах працаваў памочнікам дэпутата Палаты прадстаўнікоў па мясцовым самакіраванні, дзяржбудаўніцтве і рэгламенце.

# Рэферэндум пераменаў

**Пачатак на с.1**

Зрэшты, гаворка не вядзецца пра нейкі закрыты блок некалькіх структур – *«дзверы адчынены»*.

Адзін з кіраўнікоў «Гавары праўду» **Андрэй Дзмітрыеў** заўважыў, што гаворка вядзецца пра шырокае аб'яднанне *«усіх, хто кажа на кухнях, што так далей жыць нельга»*, каб грамадства не назірала на высілкі апазіцыі збоч і мела магчымасць выказаць свой пункт гледжання. Так паўстане *«краіна новай большасці» – «большасці пераменаў»*

Першы намеснік старшыні «За Свабоду» **Юрась Губарэвіч** паразважаў пра тое, ці рэальна сёння правядзенне рэферэндума без фальсіфкацый: «Нерэальна. Народны рэферэндум – гэта значыць, па правілах і пад кантролем грамадства. Улада не зможа «выйграць» такі рэферэндум у народа».

Сапраўдны рэферэндум, па словах Губарэвіча, не павінен праводзіцца камісіямі, якія ладзілі ранейшыя галасаванні. Але каб камісіі былі іншымі, а назіральнікі мелі больш шырокія правы, апазіцыі патрэбна нарошчваць падтрымку грамадства. Гэтага можна дасягнуць толькі праз стасаванне з народам.

На мясцовых выбарах патэнцыйныя рэферэндумныя пытанні ўвойдуць у праграмы кандыдатаў з агульнага спісу.

*«Не трэба баяцца, што пакуль з намі не ўся апазіцыя. Досвед паказвае, што калі шырокае кола, то можна ад пачатку забалбатаць працэс. Мы ў «тройцы»*





*доўга працавалі разам, каб выйсці з такім планам працы з людзьмі, што важна. Таму перакана्ны, нас многія актывісты падтрымаюць»*, – кажа Мілінкевіч. Па яго словах, *«цягнік мусіць рухацца, а не стаяць на парах»*.

Дарэчы, як паведаміў Юрась Губарэвіч, падчас мясцовых выбараў пачнецца збор першых подпісаў за народны рэферэндум. Мэты сабраць неабходную колькасць для правядзення плебісцыту тады стаяць не будзе. Калі за апазіцыяй будзе большасць, паўстануць спачатку пытанні пра змены ў заканадаўстве, пра змены ў фармаванні выбарчых камісій. Тады можа быць запушчана фармальная працэдура ініцыявання рэферэндума пераменаў.

## Рэакцыя ў апазіцыі

Астатняя апазіцыя пакуль адрэагавала на рэферэндумную ініцыятыву ці то моўчкі, ці то крыклівакрытычна.

Палітолаг, журналіст з радыё «Свабода» **Юры Дракахруст** з гэтай нагоды нават прыгадаў анекдот: *«Ідзе экскурсія па пекле. Катлы з амерыканцамі, немцамі, іншымі пільна ахоўваюць чэрці. І раптам наведнікі бачаць кацёл без ніякай аховы. Як, чаму? А навошта, адказвае гід, там калі хто і паспрабуе вылезці, дык свае ж за ногі ўніз сцягнуць. Ну вы разумееце пра што я. Пра дзіўную рэакцыю на ідэю трох арганізацый наконт «Народнага рэферэндуму».*

*«Я не пра тое, што ідэя добрая*, – працягвае эксперт. – *Я пра некалькі яе асаблівасцяў. Яна – не пра стварэнне новага камітэту, штабу, ураду ў ценевым выгнанні, не пра чарговы блок, саюз ці каардынацыйны цэнтр (хаця і пра гэта, але не гэта галоўнае). Яна – пра нейкую форму працы з насельніцтвам, з народам. Ініцыятары «Народнага рэферэндуму» нават не казалі, што ўсе павінны далучыцца да іх, інакш на тых, хто не далучыўся, кладзецца віна за паразу беларускай дэмакратыі і таўро здраднікаў і раскольнікаў. Дзяжурныя заклікі да адзінства былі, але тройка палітыкаў дала зразумець, што ў горшым выпадку спадзяецца справіцца і сваімі сіламі.*



SVABODA.ORG

*Ну і чаго, здавалася б, варта чакаць ад калегпалітыкаў, скептыкаў і нават нядобразычліўцаў? Ды баўцеся, чым хочаце, поспехаў вам, у нас сваіх справаў па горла, галаву не падняць. Ці нават злоснае – не, гэта кепска, бо перашкаджае нашай пераможнай кампаніі, ну скажам, «За сякеры і на дахі». Але рэакцыя была нейкай не такой. Ідэю пачалі дружна ганіць, хаця яе рэалізацыя не перашкаджае, здаецца, нічыім велічным планам. Ці перашкаджае? Я вось так і не зразумеў, якім менавіта. Можа ў тым і справа, што спрэчная, але хаця б нейкая ідэя – непрыемны ўзор для параўнання».*

# (працяг)

## Пайшлі ў народ

Дарэчы, ініцыятары «Народнага рэферэндума» пайшлі, як і абяцалі, у народ.

Так, 5 і 6 чэрвеня кіраўнікі Партыі БНФ, кампаніі «Гавары праўду» і Руху «За Свабоду» пачалі сустрэчы з насельніцтвам Беларусі на тэму правядзення «Народнага рэферэндума» з Белаазёрска і Брэста.

З жыхарамі Брэста размова адбылася на мясцовым аўтарынку. *«Людзі актыўна падыходзілі, нягледзячы на тое што нам замінала адміністрацыя рынка. Дырэктар рынка быў супраць здымак сустрэчы журналістамі і выклікаў міліцыю. Тым не менш людзі цікаўна падыходзілі, шмат хто пазнаваў Аляксандра Мілінкевіча»*, – распавёў першы намеснік старшыні Руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч.

Найбольш смелымі ды актыўнымі былі кабеты-прадавачкі. Яны падымалі такія праблемныя пытанні, як недасканалае медычнае абслугоўванне, нізкая якасць рамонту дарог, замаруджванне з рэалізацыяй пагаднення пра малы памежны рух. Разам з тым гаворка вялася пра складанасці ў атрыманні незалежнай інфармацыі.

*«Многія казалі, што змест дзяржаўных тэлеканалаў не задавальняе, а на шляху незалежнай інфармацыі ставяцца перашкоды. Так, згадвалі свежы закон, які абцяжарвае ўсталяванне спадарожнікавых антэн, каб глядзець той самы «Белсат». Адзначалася, што ў канфліктных сітуацыях цяжка дзейнічаць, бо мясцовая ўлада непадкантрольная, не абраная. Можна было б вырашаць праблему праз суд, але каб ён быў незалежны»*, – такімі думкамі, па словах Губарэвіча, дзяліліся людзі.

*«Шмат якія праблемы не вырашыш лакальна, не змяняючы сістэму ва ўсёй краіне. Людзі гэта разумеюць, таму ў размовах мы чулі словы падтрымкі ідэі «Народнага рэферэндума»*, – робіць выснову Юрась Губарэвіч.


RACYJA.EU


RACYJA.EU


TUT.BY


RACYJA.EU


RACYJA.EU


RACYJA.EU


TUT.BY


RACYJA.EU

# Мілінкевіч: Рэформы ці сыход!

**Пра мэты «Народнага рэферэндума», пра шанцы на перамены, пра стасункі са стаўшай партнёрам кампаніяй «Гавары праўду» лідар Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч распавёў у інтэрв'ю «Брэсцкай газеце».**

## За лепшую краіну!

Звычайна апазіцыя далёкая ад народа. І гэта наша праблема. Народ скардзіцца: улада занятая сваім, апазіцыя – сваім, а мы самі па сабе. І мы б хацелі ўсё ж такі паказаць людзям, што мы таксама жывем у гэтай краіне, не збіраемся эміграваць і хочам разам адстойваць нашы інтарэсы. Іх трэба адстойваць у любой краіне, нават дэмакратычнай. Наша ідэя палягае ў тым, каб падчас сустрэч з дапамогай грамадзян Беларусі, з дапамогай экспертаў сфармуляваць для магчымага рэферэндуму простыя, ясныя сацыяльна-эканамічныя пытанні і вынесці іх на абмеркаванне.

Нам кажуць: *«Ведаеце, а ўлада ж вам не дазволіць»*. Але мы прывыклі, што ўлада нам не дазваляе. Мы разумеем, што ўлада можа не пайсці на гэтую ініцыятыву. Яна даволі складаная: вялікая група зборшчыкаў подпісаў, трэба сабраць 450 тысяч подпісаў, каб рэферэндум быў. Няпроста, асабліва ва ўмовах такога прэсінгу. Але нават калі ўлада скажа, што вось вы сфармулявалі пытанні, а мы не хочам на іх адказваць, выносіць іх на рэферэндум, мы лічым, што гэта таксама вынік. Мы пакажам, што людзі сфармулявалі, што людзі хочуць ведаць адказы.

Нам важна ўключыць у вызначэнне таго, што самае важнае для краіны, людзей, каб яны адчулі, што ад іх таксама нешта залежыць. Што яны нейкая сіла, калі яны разам. Пры гэтым мы не прапануем рэвалюцыйны пераварот. Мы не кажам, што заўтра з віламі прыйдзем сюды і будзем выкідаць людзей з крэслаў. Проста мы хочам жыць у іншай краіне, у лепшай краіне. І французы, і немцы хочуць жыць у лепшай краіне. Гэта мірная акцыя, але жорстка вызначаная, таму што праблема беларускага грамадства ў тым, што яно не самаарганізаванае, яно не ўмее абараняць свае правы. Мы хочам абудзіць у людзях вось гэтую цікавасць да грамадскага, палітычнага жыцця.



> ***«Каб людзі адчулі, што ад іх таксама нешта залежыць. Што яны нейкая сіла, калі яны разам»***

Улада павінна задумацца. Калі яна не выбіраецца людзьмі, а прызначаецца, то хоць бы праз такі спосаб, праз медыя, праз рэферэндум трэба ёй паказаць, што ёсць пытанні, якія патрабуюць вырашэння. І мы гатовыя дапамагаць, а не крычаць «ах вы такія-сякія!». Але калі вы адмовіцеся, тады мы скажам, што вы – не вартая ўлада. Вось такая ідэя.

## «У апазіцыі патрэбна новая хваля»

З «Гавары праўду» былі складаныя адносіны падчас выбараў, па розных прычынах. З БНФ было прасцей, там ідэалагічных разыходжанняў няма. Але мы вырашылі, што трэба глядзець не назад, а наперад, і трэба не ствараць ворагаў, а шукаць сяброў. Мы хочам рухацца ў гэтым кірунку. І яшчэ, я думаю, вельмі важная змена пакаленняў у апазіцыі. І я страшэнна рады, што побач тры маладыя чалавекі – Аляксей Янукевіч (БНФ), Юрась Губарэвіч (першы намеснік старшыні Руху «За Свабоду»), Андрэй Дзмітрыеў («Гавары праўду»), вельмі крэатыўныя людзі. Мы, вядома, таксама будзем працаваць, але патрэбна новая хваля ў апазіцыі, гэта адназначна. Новы энтузіязм, новыя ідэі.

Мне падабаецца, як яны працуюць. Гэтыя людзі добрыя тым, што яны цвяроза глядзяць на жыццё, яны не авантурысты. Яны не лічаць, што вось калі я прарваўся на старонкі прэсы, то я ўжо герой і мне пара ўжо ісці ў прэзідэнты. Ведаеце, каб пайсці ў прэзідэнты, трэба хоць бы дзіцячым садком пакіраваць.

У апазіцыі цяпер ёсць вялікая праблема. Тое, што нас няма ва ўладзе з 1996 года, прывяло да таго, што людзі кажуць: «Ну, вы сімпатычныя, вы – за праўду, за справядлівасць, а чаму пры вас будзе жыццё лепш? Вы зможаце гэта зрабіць? А вы ўмееце? Вы кіравалі калі-небудзь?» Гэта страшна вялікая праблема. У апазіцыі вельмі шмат добрых, годных людзей. Я маю на ўвазе шырокую апазіцыю, не толькі палітычную. Але сказаць, што ў іх ёсць вопыт кіраўніцтва – не. І гэта праблема вялікая, таму што людзі ўсё ж такі хочуць мець нейкую гарантыю.

## «Улада можа пачаць рэформы»

Гэтая ўлада не дапусціць канкурэнцыі на прэзідэнцкіх выбарах. Я не веру, што пры гэтай уладзе будуць лічыць галасы. Але ўлада можа пачаць рэформы.

Былі такія прыклады ў Іспаніі, у Чылі, дзе Пiначэта, які знішчыў вялікую колькасць людзей і разам з тым каласальна падняў эканоміку, прымусіў сысці менавіта народны рэферэндум, калі ён не змог яму супрацiўляцца. Я не кажу, што ў нас будзе дакладна такі сцэнар, але гэта мірны спосаб. Ці ўлада пачынае рабіць рэформы, ці яна павінна сысці! Наша ўлада павінна думаць, які варыянт ёй прымальны.

# “Хацелася быць падобным да Быкава”

**22 траўня – 10 год без Васіля Быкава. Да сумнае даты радыё «Свабода» сабрала ўспаміны пра выбітнага пісьменніка.**



Пра гарадзенскі перыяд Быкава прыгадаў Аляксандр Мілінкевіч:

– У мяне да Васіля Уладзіміравіча вельмі асабістыя адносіны, і я шчаслівы тым, што ведаў яго яшчэ тады, калі ён працаваў у Гародні і не быў яшчэ такім знакамітым пісьменнікам.

Мой бацька быў вельмі вядомым на Гарадзеншчыне настаўнікам, дырэктарам школы, часта сустракаўся з Васілём Уладзіміравічам. Тое, што памятаю пра тыя сустрэчы, – то тое, што гэты чалавек быў нешматслоўны, але ён выдатна ўмеў слухаць. Калі гаварыў, то гаварыў шчырую праўду. І бацька ліваў, што гэта дзіўны чалавек – калі вакол столькі няпраўды, у гэтага чалавека проста агіда да фальшу.

І вельмі ўдзячны я бацьку, што мог прачытаць тады Быкава, а чытаць творы яго прыходзілася на надрукаваных аркушах. І першыя ягоныя творы, якія ў Гародні распаўсюджваліся, зрабілі вялікі-вялікі ўплыў на маю любоў да беларушчыны.

Бацька казаў, што Быкаў дзіўна піша пра вайну і што ў яго творах практычна няма камуністаў. А вядома ж, як выкладалася тады гісторыя вайны: што перамога – галоўная заслуга КПСС, бо менавіта пад кіраўніцтвам партыі народ перамог на вайне.

Працяг на с.8

# Пераможцы-каліноўцы

**29 чэрвеня ў офісе Руху ”За Свабоду” адбыліся фінал і суперфінал конкурсу “Лепшы знаўца паўстання Кастуся Каліноўскага”.**








У яго выйшлі дзесяць пераможцаў інтэрнэт-віктарыны, у якой агулам узялі ўдзел каля 600 чалавек.

Фінальны тур складаўся з пісьмовага тэсту, па выніках якога вызначыліся тры суперфіналісты. У фармаце “Брэйн-рынгу” яны разыгралі між сабой галоўныя прызы – планшэт і букрыдары.

Усе 10 фіналістаў атрымалі па кнізе пра Каліноўскага і настольную гульню “Паўстанцы”.

Першае месца заваяваў **Васіль Герасімчык** з Гродна, другое – **Павел Абламскі** з Брэста , трэцяе – **Алесь Лапо** з Нясвіжа.












# Прэмія Быкава – у Марачкіна і Вайцюшкевіча

**19 чэрвеня на радзіме Васіля Быкава (у вёсцы Бычкі ва Ўшацкім раёне) адбылося ўручэнне сёлетняй прэміі “За свабоду думкі”, заснаванай кіраўніком Руху “За Свабоду” Аляксандрам Мілінкевічам.**




Прэміяй “За свабоду думкі” імя Васіля Быкава ў гэтым годзе ўганараваны мастак **Алесь Марачкін** і музыка **Зміцер Вацюшкевіч**.

Лаўрэата абралі ўладальнікі прэміі мінулых гадоў: імі станавіліся літаратары Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў, палітык-літаратар Павел Севярынец, затым мастак Алесь Пушкін, краязнаўца Ада Райчонак, палітык-паэт Уладзімір Някляеў, музыка Лявон Вольскі і краязнаўца Алесь Белакоз.

Нагадаем, прэмія “За свабоду думкі” імя Васіля Быкава заснаваная лідарам Руху “За Свабоду” Аляксандрам Мілінкевічам у 2008 годзе. Прызначэннем прэміі з’яўляецца ўслаўленне моцы думкі і духу, плённай працы на ніве беларушчыны. Ідэя заснаваць яе ўзнікла пасля атрымання Мілінкевічам прэміі “За свабоду думкі” імя Андрэя Сахарава, якую ўручае Еўрапарламент.









# Падобным да Быкава (працяг)

Пачатак на с.7

Памятаю таксама, якое вялікае ўражанне на мяне, тады першакурсніка фізічнага факультэта Гарадзенскага пэдінстытута, зрабіла ягоная аповесць «Мёртвым не баліць». Гэта быў 66-ты год. Я быў проста агаломшаны яе жорсткай рэчаіснасцю, якойсьці іншай вайной, тым, як аўтар напісаў пра цынічную ўладу, чалавечыя трагедыі, пра бяспраўе простага чалавека.

Пасля гэтага ў Гародні пачалася проста поўная вакханалія. Супраць Быкава змагаліся і партыйныя органы, і КДБ, і горад гаварыў пра гэта. У вокны кватэры Быкавых паляцелі камяні, пабілі шкло, жонку закідвалі памідорамі. Быкава збівалі разам з іншым вядомым гарадзенскім пісьменнікам Аляксеем Карпюком.

Гародня ведала пра гэта. Людзі збольшага баяліся заступіцца, але разумелі, што гэтых людзей перасьледуюць за праўду. Моладзь студэнцкая таксама была запалоханая, але разумела, што з Быкава спрабуюць зрабіць такога беларускага Салжаніцына. Усе былі ўпэўненыя, што хочуць, каб ён з’ехаў за мяжу, а ён застаўся.

> ***Усе былі ўпэўненыя, што хочуць, каб ён з’ехаў за мяжу, а ён застаўся.***

Ён застаўся, і тады, я памятаю, мы глядзелі на Саюз пісьменнікаў, які месціўся ў доміку Элізы Ажэшкі якраз насупраць вокнаў нашага фізічнага факультэта, як на такі цэнтр вальнадумства, цэнтар моцнага духу, хоць усе іх прадстаўлялі паўсюль на партыйных сходах як ідэалпгічных дыверсантаў.

Быкава ўберагла тады тая ідэалагічная адліга, якая ў Маскве пусціла значна большыя карані, і калі ў 74-м годзе ён атрымаў Дзяржаўную прэмію, гэтыя перасьледы гарадзенскія значна зменшыліся.

Таксама для яго велізарнай падтрымкай было тое, што яго пачаў друкаваць – фактычна ўсё, што ён накіроўваў, – Твардоўскі ў «Новом мире».

Быкаў для мяне кім застаўся? Я больш памятаю яго таго, гарадзенскага, таму што многа было сустрэчаў, размоваў. Для мяне, тады абсалютна маладога чалавека, ён быў ужо чалавекам вядомым, чалавекам мужным, чалавекам смелым. І хацелася быць падобным да яго. І лічу, што ён быў проста суперпрыкладам такой літаратурнай і грамадзянскай стойкасці.

Газета выдаецца Рухам “За Свабоду”. Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна.
Падпісана ў друк 29.06.2013 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@pyx.by